## Да юбілею Мікалая Яроменкі

Іх называюць: Яроменка-старэйшы і Яроменка-малодшы. Бацька і сын: два Мікалаі, вядомыя, таленавітыя, якія зняліся амаль у 50 кінафільмах кожны. А ў стужцы Мікалая Яроменкі-малодшага "Сын за бацьку" сыгралі дуэтам. 27 лістапада 2001 г. у Мінску, на доме № 16 па вуліцы М. Танка ўрачыста адкрыта мемарыяльная дошка ў гонар Мікалая Мікалаевіча Яроменкі – народнага артыста Беларусі і СССР, вядомага грамадскага дзеяча. Сюды, у гэты дом, прыязджаў з Масквы Яроменка-малодшы, каб спачыць душой. Цяпер тут жыве гаспадыня гэтай сапраўды унікальнай сям'і, удава, маці, народная артыстка Беларусі Галіна Аляксандраўна Арлова.

"Я пражыў вялікае жыццё. Ніякіх подзвігаў не здзяйсняў, але ў душы веру, што здолею пакінуць свой след, захаваўшы сябе чалавекам. Я больш аддаў людзям, чым узяў ад іх. І назаўсёды застануся верным гэтаму прынцыпу", – гаварыў пра сябе акцёр (кніга Г. Арловай "Тры я", прысвечаная творчай сям'і Яроменкаў). І гэта было сапраўды так. А цяпер людзі аддаюць яму – памяццю і пашанай.

Што вызначае шлях чалавека да мастацтва? Ці існуе заканамернасць, якая абумоўлівае выбар акцёрскай прафесіі? Адназначна не адкажаш – маюць значэнне і спрыяльныя жыццёвыя абставіны, і адпаведныя ўмовы выхавання, і проста шчаслівы выпадак. Наўрад ці падлеткам Мікалай Яроменка мог прадбачыць, што стане акцёрам. Нарадзіўся ён у Новасібірску, скончыў рамеснае вучылішча, рана пайшоў на завод, дзе працаваў токарам, потым паступіў у Новасібірскае ваеннае вучылішча. Вялікая Айчынная вайна ўнесла бязлітасныя карэктывы ў лёс юнака. Камандзір кавалерыйскага ўзвода Мікалай Яроменка ваяваў на Калінінскім фронце, у 1942 г. у баях пад Вязьмай быў цяжка паранены, трапіў у фашысцкі палон і стаў вязнем штрафнога лагера для савецкіх афіцэраў у Штутгарце. Амаль тры гады прабыў у лагерах ваеннапалонных, удзельнічаў у падпольнай антыфашысцкай арганізацыі. На чужой зямлі, далёка ад роднай Бацькаўшчыны, сустрэў светлы дзень Перамогі. Пасля вайны яшчэ некаторы час працаваў у Венгрыі, дапамагаючы рэпатрыіраваць савецкіх грамадзян на Радзіму. У снежні 1945 г. ён вяртаецца на Беларусь і становіцца культасветработнікам, узначальвае Бешанковіцкі дом культуры. У 1946 г. на аглядзе мастацкай самадзейнасці ў Віцебску Мікалая Яроменку заўважыў знакаміты майстар беларускай сцэны Аляксандр Ільінскі, які запрасіў здольнага юнака вучыцца ў драматычную студыю пры тэатры імя Я. Коласа. Заняткі ў студыі, сустрэчы з цудоўнымі педагогамі і артыстамі (П. Малчанавым, Ц. Сяргейчыкам, Л. Мазалеўскай, А. Ільінскім, А. Радзялоўскай) садзейнічалі раскрыццю таленту, фарміраванню светапогляду, творчых адносін да працы. Менавіта ў студыі Мікалай Яроменка ўпершыню пазнаёміўся з сістэмай вядомага рэфарматара рускай сцэны К.С. Станіслаўскага, творчыя запаветы якога сталі вызначальнымі ў яго далейшай тэатральнай дзейнасці. Значна пазней (у 1976 г.) Мікалай Мікалаевіч у надрукаваным у газеце "Літаратура і мастацтва" дыялогу з тэатразнаўцам А. Сабалеўскім сфармуліруе сваё творчае крэда: "У межах рэалізму, як вядома, ёсць розныя творчыя кірункі. Што тычыцца асабіста мяне, то я з'яўляюся прыхільнікам псіхалагічнага тэатра. Лічу самым высокім з пункту гледжання яго магчымасцей і самым складаным з пункту гледжання творчасці".

У 1948 г. М. Яроменка залічаны ў трупу тэатра імя Я. Коласа, дзе пачаўся яго самастойны шлях на прафесійнай сцэне. Творчы дыяпазон маладога акцёра быў вельмі шырокі. Ён стварае розныя, непадобныя, вельмі разнастайныя сцэнічныя тыпы і характары. У яго рэпертуары – героі твораў Віктара Розава і Юлія Чапурына, Данііла Граніна і Галіны Нікалаевай, Сяргея Смірнова і Пятра Глебкі, М. Горкага і Л. Талстога. Аднак у гэтай стракатасці яго рэпертуару ў хуткім часе пачынаюць вызначацца ролі асноўныя, у якіх акцёр можа сказаць сваё важкае ўласнае слова. Вызначаючы адметнасць індывідуальнасці

М. Яроменкі, крытыка адзінадушна падкрэслівала грамадзянскі аспект яго творчасці. Вобразы сацыяльных герояў, людзей па натуры цэльных, валявых, моцных духам, упэўненых у абавязковай перамозе дабра над злом надзвычай удаваліся акцёру. У 1950 г. ён ужо сыграў Інсарава ў інсцэніроўцы па раману І. Тургенева “Напярэдадні”, пазней у драматычнай паэме П. Глебкі “Святло з Усходу” ўвасобіў вобраз рэвалюцыянера Азорыча, у “Бітве ў дарозе” паводле рамана Г. Нікалаевай паказаў бескампраміснага Бахірава.

У 1955 г. М. Яроменку было прысвоена званне заслужанага артыста БССР. У 1959 г. яго запрашаюць у трупу тэатра імя Я. Купалы. Тут, у славутым калектыве купалаўцаў, для акцёра пачалося новае творчае жыццё. Больш трыццаці гадоў М.М. Яроменка (народны артыст БССР, 1964; народны артыст СССР, 1989) аддаў купалаўскай сцэне, тры з іх – у якасці дырэктара тэатра. Людзі ішлі ў тэатр “на Яроменку”. Што можа быць больш высокай адзнакай акцёру? Грэкаў у “Ворагах” М. Горкага, Міканор у “Людзях на балоце” І. Мележа, Канстанцін Заслонаў у п’есе А. Маўзона, Вяршыла ў “Мудрамеры” М. Матукоўскага (Дзяржаўная прэмія Беларусі 1988), Вышнеўскі ў “Даходным месцы” А. Астроўскага, Нікіцін у “Беразе” паводле Ю. Бондарава, Арнхольм у “Жанчыне з мора” Г. Ібсена… Вяршыняй творчасці М.М. Яроменкі сталі яго апошнія ролі: сэр Джон (“Касцюмер” Р. Харвуда) у Тэатры імя Я. Купалы і Бернард Шоу (“Мілы лжэц” Дж. Кілці) у Тэатры-студыі кінаакцёра. Апошні ў жыцці акцёра спектакль “Мілы лжэц” адбыўся за тры дні да яго смерці – 27 чэрвеня 2000 г.

Кінематограф – таксама яркая старонка ў творчай біяграфіі акцёра, ён прынёс Мікалаю Мікалаевічу вялікую папулярнасць. У кіно ён лічыў сябе вучнем такіх вядомых савецкіх кінарэжысёраў, як У.У. Корш-Саблін і С.А. Герасімаў. На рахунку Яроменкі-кінаакцёра паўсотні мастацкіх і тэлевізійных фільмаў, сярод якіх: “Наперадзе круты паварот” (следчы Радзевіч), “Першыя выпрабаванні” (настаўнік Тадорык), “Людзі і звяры” (савецкі афіцэр Аляксей Паўлаў), “Масква–Генуя” (белагвардзейскі афіцэр Русанаў), “Запомнім гэты дзень” (эсэр Ясень), “Іван Макаравіч” (бацька дванаццацігадовага Вані), “Крушэнне імперыі” (рабочы рэвалюцыянер Ваулін) і г.д. У рэжысёрскім дэбюце Яроменкі-малодшага, фільме “Сын за бацьку”, Мікалай Мікалаевіч сыграў галоўную ролю загадчыка правінцыяльнай паліклінікі. На Першым нацыянальным фестывалі беларускіх фільмаў, што праходзіў у Брэсце, Яроменка-старэйшы атрымаў Гран-пры за лепшую мужчынскую ролю і за вялікі ўклад у беларускае кінамастацтва.

Шмат часу забірала і актыўная грамадская праца Мікалая Мікалаевіча. Ён кіраваў Беларускім тэатральным аб’яднаннем (1976–1987), Саюзам тэатральных дзеячаў Беларусі (1987–1992), з 1992 г. быў прэзідэнтам Беларускай канфедэрацыі творчых саюзаў і культурных фондаў, у апошнія гады жыцця кіраваў Саветам прэзідэнцкага фонду матэрыяльнай дапамогі маладым талентам, быў сенатарам беларускага парламента, лідэрам беларускай інтэлігенцыі. У 1996 г. ён узнагароджаны медалём Ф. Скарыны. “Апошнім рамантыкам XX стагоддзя, які шчыра верыў, што свет можна змяніць да лепшага”, назваў М.М. Яроменку народны артыст Беларусі Уладзімір Гасцюхін.